# АД НАРОДНАЙ МАСТАЦКАЙ ВУЧЭЛЬНІ ДА ВІЦЕБСКАГА МАСТАЦКА-ПРАКТИЧНАГА ІНСТЫТУТА: ЧАТЫРЫ КІРАЎНІКІ

# FROM PUBLIC ART SCHOOL TO THE ART PRACTICAL INSTITUTE: FOUR PRINCIPALS

Я. Ю. Ленсу
Ya.Yu. Lensu

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў
Мінск, Рэспубліка Беларусь
Belarusian State Academy of Arts
Minsk, Republic Belarus
*e-mail: lensu50@inbox.ru*

Разглядаецца гісторыя віцебскай мастацкай школы ад Народнай вучэльні, створанай у 1918 г., да Мастацка-практычнага інстытута, які працаваў да 1923 г., у ракурсе змены кіраўнікоў гэтай навучальнай установы. Усяго ў Віцебску было чатыры кіраўнікі мастацкай навучальнай установы, якая працавала тут – ад Марка Шагала, які заклаў асновы школы, да Мсціслава Дабужынскага, Веры Ермалаевай і Івана Гаўрыса, якія, кожны па-свойму, унеслі свой унёсак у развіццё школы.

*Ключавыя словы:* віцебская мастацкая школа; авангардызм; УНОВИС; Віцебскі мастацка-практычны інстытут.

The article describes the history of Vitebsk art school from establishing Public art school in 1918 to becoming Art practical institute functioning till 1923, in the context of principals replacement from this educational institution. There were only four principals of the art educational institution functioning in Vitebsk - from Mark Chagall, who laid the foundations of the school, to Mstislav Dobuzhinskiy, Vera Yermolayeva and Ivan Gavris, who, each in his own individual way, made their contributions to the development of the school.

*Keywords:* Vitebsk art school; avant-gardism; UNOVIS; Vitebsk art-practical institute.

Пачалося ўсё з рашэння, прынятага ў 1918 годзе, аб стварэнні ў Віцебску *Народнага мастацкага вучылішча* на базе існаваўшай у горадзе з канца XIX ст. прыватнай мастацкай школы-майстэрні *Юдаля Пэна*. Быў прызначаны і дырэктар вучылішча – малады мастак, выхаванец школы Пэна *Марк Шагал*, у той час упаўнаважаны па справах мастацкай прамысловасці пры Камісарыяце народнай адукацыі Віцебскай губерні.

Асноўная задача вучылішча была, як казаў сам Шагал, «… парваць з руцінай акадэміі, даць шырокую магчымасць расквітнець «леваму мастацтву» [1, с.7]. У новую навучальную ўстанову на працягу некалькіх дзён запісалася больш за сто чалавек – маладых рабочых і сялян. Однак пэўны час усё заставалася на ўзроўні добрых намераў: для рэальнага стварэння вучылішча не хапала асноўнага – выкладчыкаў.

І вось дырэктар новастворанага вучылішча звяртаецца да калег-мастакоў, каб яны дапамаглі ў стварэнні маладой мастацкай школы. У канцы 1918 г. у газеце *«Искусство коммуны»* друкуецца артыкул Шагала, у якім ён запрашае мастакоў з розных гарадоў краіны прыехаць у Віцебск.

Заклік Шагала быў пачуты. У Віцебск сталі прыязджаць вядомыя мастакі, у асноўным з Масквы і Петраграда. Першым прыехаў вядомы мастак-графік *Мсціслаў Дабужынскі*, якому Шагал перадаў кіраўніцтва вучылішчам. У канцы студзеня 1918 года Дабужынскі афіцыйна ўступае на пасаду дырэктара Віцебскай народнай мастацкай вучэльні. У Віцебску Мсціслаў Дабужынскі працаваў нядоўга – ужо ў лютым 1919 года ён вярнуўся ў Петраград. Аднак мастак з самага пачатку свайго прызначэння на пасаду дырэктара Народнай вучэльні актыўна ўзяўся за справу і за кароткі час змог нямала зрабіць для станаўлення гэтай навучальнай установы і развіцця мастацкага жыцця ў горадзе. Дабужынскі прыняў ўдзел у стварэнні Віцебскага музея мастацкай культуры. У снежні 1918 года ён удзельнічаў у рабоце журы конкурсу вывесак для школ. Калі ў студзені 1919 года прыйшла вестка аб забойстве ў Берліне дзеячоў германскага і міжнароднага камуністычнага руху *Карла Лібкнехта* і *Розы Люксембург*, Дабужынскі аформіў сцэну ў гарадскім тэатры ў памяць Карла Лібкнехта. *28 студзеня 1919 года* Мсціслаў Валерыянавіч удзельнічаў ва ўрачыстым адкрыцці Народнай мастацкай вучэльні.

У час свойго прабывання ў Віцебску Дабужынскі таксама рабіў накіды і эцюды на вуліцах горада. На адной з графічных работ мастака, выкананай графітным і каляровым алоўкамі з выкарыстаннем акварэлі, можна бачыць плаціну на рацэ Віцьба. Злева ад яе выяўлена забудова Смаленскай вуліцы, а зверху пачатак вуліцы Багаслоўскай і калакольні Мікалаеўскай і Багаслоўскай цэркваў. Захавалася таксама акварэль, на якой адлюстраваны невялікія каменныя віцебская домікі з драўлянымі сенцамі і лесвіцамі каля ўваходу, якія пакасіліся ад часу. Яшчэ больш жывапісную лесвіцу можна бачыць на літаграфіі, зробленай Дабужынскім ў 1923 годзе, ужо пасля ад'езду з Віцебску па зробленаму там накіду.

На другой літаграфіі, таксама 1923 года, выяўлены заснежаны зімні горад і віцебскі драўляны цырк, таксама пакрыты снежным покрывам. Дабужынскі ж у Петраградзе поўнасцю аддаецца мастацкай твор-

часці: робіць ілюстрацыі да твораў А. С. Пушкіна, М. Ю. Лермантава, Ф. М. Дастаеўскага, М. С. Ляскова, Г. Х. Андэрсана, В. Э. Мандэльштама і інш. У 1923–1924 гадах ён шмат вандраваў, аб'ехаў шмат гарадоў – быў у Каўнасе, Берліне, Парыжы, Амстэрдаме, Капенгагене. У Парыжы прайшла яго персанальная выстава. У 1924 годзе Дабужынскі прымае літоўскае грамадзянства і з'язджае з СССР. Некаторы час мастак жыве ў Рызе, а ў 1926 годзе пераязджае ў Парыж. Але ў 1929 годзе зноў едзе ў Літву і да 1935 года жыве ў Каўнасе. Тут ён выкладае ў *Каўнаскай мастацкай школе*, з 1931 ж года з'яўляецца галоўным мастаком *Літоўскага дзяржаўнага тэатра*. У 1935 годзе Дабужынскі з трупай тэатра адязджае ў Англію. Тут па ініцыятыве *Міхаіла Чэхава* ўдзельнічае ў пастаноўцы спектакля *«Бесы»* па Дастаеўскаму. У 1939 годзе для працягу працы з тэатрам-студэяй Чэхава пераязджае ў ЗША, у Нью-Ёрк. Апошнія гады жыцця мастак праводзіць ў Еўропе, пераязджаючы з Парыжа ў Рым, адтуль у Лондан, вандруе па Італіі. Незадоўга да смерці вяртаецца ў ЗША. Памёр Мсціслаў Дабужынскі ў лістападзе 1957 года ў Нью-Ёрку ў 82-гадовым узросце ў доме свайго малодшага сына Усевалада. Пахаваны на могілках Сен-Жэнеўеў-дэ-Буа ў Парыжы.

Пасля ад'езду з Віцебска Дабужынскага пасаду кіраўніка вучэбнай установы зноў бярэ на сябе Марк Шагал. Але неўзабаве ў выніку рознагалоссяў з прыехаўшым да таго часу ў Віцебск *Казімірам Малевічам* Шагалу прыйшлося пакінуць родны горад. Ён перабраўся ў Маскву, дзе займаўся тым, што вучыў дзяцей маляванню ды пісаў дэкарацыі для *Яўрэйскага камернага тэатра*. У 1922 годзе Шагал выязджае ў Берлін для ўдзелу ў *Першай рускай мастацкай выставе*, якая праводзілася ў германскай сталіцы. З сабою ён бярэ большасць сваіх работ. Творчасць мастака на Захадзе ўспрымаецца з захапленнем. Заставалася толькі ўзяць з сабою за мяжу сям'ю, што і было неўзабаве зроблена. З гэтай пары Шагал назаўсёды застаецца ў замежжы. Пражыўшы ў Берліне больш за год, у 1923 мастак пераязджае ў Парыж, дзе і застаецца на многія гады. Далейшы яго лёс, як вядома, склаўся вельмі ўдала – набыўшы сусветную вядомасць, Шагал стаў адным з самых занакамітых мастакоў XX стагоддзя. Памёр Марк Захаравіч у Парыжы ў 1985 годзе ў 97-гадовым узросце.

Калі з Віцебску з'ехаў Марк Шагал, на пасадзе кіраўніка *Свабодных мастацкіх майстэрняў*, як тады ўжо называлася Народная мастацкая вучэльня, яго змяняе *Вера Ермалаева*. У 1919 годзе Вера Ермалаева разам з іншымі запрошанымі Шагалам мастакамі прыязджае ў Віцебск працаваць у Народным мастацкім вучылішчы. Тут яна спачатку кіравала жывапіснай майстэрняй і ўвайшла ў прэзідыум вучылішча. Цяпер жа

Ермалаева робіцца першай асобай у Свабодных мастацкіх майстэрнях. Пасля ж прыезду ў Віцебск Казіміра Малевіча Ермалаева робіцца яго бліжэйшай паплечніцай. Менавіта яны ўдваіх сталі заснавальнікамі аб'яднання *УНОВИС*. У дзейнасці членаў УНОВИСа праявіліся парасткі таго, што мы сёння называем прамысловым дызайнам. Гэта УНОВИС высунуў патрабаванне «вытворчасці праектаў новых форм утылітарных патрэбнасцяў і рэалізацыі іх у жыцці».

У членаў УНОВИСа вялікія планы, вялікія надзеі. Здаецца, наперадзе шмат цікавага, значнага... Але неўзабаве ў пераўтворанай ужо ў Мастацка-практычны інстытут вучэбнай установе пачынаюцца праблемы, звязаныя і з матэрыяльнымі, і з ідэалагічнымі цяжкасцямі, з якімі сутыкнуліся выкладчыкі інстытута. У выніку мастакі пачалі пакідаць Віцебск. У 1922 годзе з'ехаў і Малевіч.

Ермалаева засталася сам на сам з усімі цяжкасцямі, якія навaліліся на Мастацка-практычны інстытут: недахоп грашовых сродкаў, нападкі ворагаў новага мастацтва. У гэты час яна працягвала займаць пасаду рэктара інстытута. У маі 1922 года пад яе кіраўніцтвам быў ажыццяўлён першы і адзіны выпуск Віцебскага мастацка-практычнага інстытута. Дыплом аб заканчэнні інстытута атрымалі 11 чалавек, 17 жа студэнтаў былі пераведзены ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Масквы і Петраграда.

У гады свайго рэктарства Ермалаева актыўна прыцягвала да працы ў інстытуце студэнтаў-старшакурснікаў. Так, навучэнцы *Міхаіл Векслер, Ніна Коган, Саламон Юдовін* кіравалі вучэбнымі майстэрнямі, а студэнт *Іван Гаўрыс* з восені 1921 года нават быў намеснікам Ермалаевай. Апошняя рабіла ўсё магчымае, каб захаваць навучальную ўстанову. Але ўжо было зразумела, што Віцебскі мастацка-практычны інстытут асуджаны на знікненне. Не бачачы выхаду са склаўшагася становішча, Ермалаева ў жніўні 1922 года ад'язджае ў Петраград.

Вярнуўшыся ў Петраград, Ермалаева атрымала пасаду кіраўніка лабараторыі колеру ў *Дзяржаўным інстытуце мастацкай культуры*, заснаваным яе паплечнікам па Віцебску Казімірам Малевічам. Але ў 1926 годзе інстытут быў ліквідаваны, а Малевіч неўзабаве рэпрэсіраваны, праўда, хутка і апраўданы. Ермалаева ж стала супрацоўнічаць з часопісамі *«Воробей», «Новый Робинзон», «Чиж»* и *«Ёж»*, працавала як жывапісец і графік, ілюстравала дзіцячыя кнігі. У 1929 годзе разам з мастакамі У*ладзімірам Сцерлігавым, Канстанцінам Раждзественскім, Львом Юдзіным, Мікалаем Суеціным, Ганнай Лепорскай* стварыла «групу жывапісна-пластычнага рэалізму». На кватэры Ермалаевай праходзілі творчыя «аўторкі» гэтых мастакоў і «кватэрныя» выставы, якія

суправаджаліся абмеркаваннямі. Гэта ўсё стала падставай для даносу нейкага «дабразычліўца».

25 снежня 1934 года Вера Ермалаева была арыштавана адначасова з некаторымі іншымі членамі гуртка. 29 марта 1935 года яна была асуджана на тры гады турэмнага зняволення, як гаварылася ў прыгаворы, за «антысавецкую дзейнасць, якая выяўлялася ў прапагандзе антысавецкіх ідэй і спробе арганізаваць вакол сябе антысавецкі настроеную інтэлігенцыю». Адбывала пакаранне мастачка ў *Карагандзінскім лагеры*. У верасні 1937 года Ермалаева была асуджана паўторна і прыгаворана да пакарання смерцю. А далей Аральскае мора. На старую баржу грузяць вялікую групу зняволеных. Баржа адчальвае ад берга і накіроўваецца ў мора. Праз некаторы час яна прычальвае да пяшчанага незаселанага вострава. Людзей высаджваюць на бераг. Баржа ўходзіць у зваротны шлях. Людзі ж застаюцца на востраве без ежы і пітва. Усе яны асуджаны на пакутніцкую смерць. Сярод гэтай групы смяротнікаў мастачка Вера Ермалаева. Па іншай версіі Вера Ермалаева была растраляна ў лагеры каля Караганды. У 1989 годзе Вера Міхайлаўна Ермалаева была рэабілітавана. З 2013 года ў Маскве існуе фонд Веры Ермалаевай, які ставіць сваёй мэтай падтрымку жаночых ініцыятыў у сучасным мастацтве.

У 1922 же годзе, калі Ермалаева пакінула Віцебск, пасаду рэктара Віцебскага мастацка-практычнага інстытута, як тады называлася гэтая навучальная ўстанова, заняў Іван Гаўрыс, выпускнік інстытута, які, як адзначалася, яшчэ будучы студэнтам, выконваў абавязкі намесніка Ермалаевай. Але вось красавік 1923 года. У Віцебскім мастацка-практычным інстытуце губернскі аддзел Рабоча-сялянскай інспекцыі праводзіць рэвізію работы гэтай вучэбнай установы, пачынаючы з 1918 года. Рэвізоры вынікамі праверкі не задаволены, па іх меркаванні, гэтая навучальная ўстанова не адпавядае свайму прызначэнню. Да таго ж дрэннае ўражанне ў правяраючых выклікае выстава студэнцкіх работ, большасць з якіх выканана ў авангардным стылі. У заключэнні камісіі было сказана, што інстытут «мае за сабой выключна адмоўныя бакі, якія заключаюцца ў прычыненні шкоды рэспубліцы сваім існаваннем». Наконт жа кіраўніка інстытута было адзначана, што ён «не атрымаў адпаведнай навуковай падрыхтоўкі для заняцця месца рэктара ў вышэйшай школе». Гаворка ідзе пра Івана Гаўрыса. У выніку Гаўрыс пазбаўляецца сваёй пасады, в. а. рэктара робіцца нехта *П. А. Тарасаў*, фігура зусім выпадковая. А некалькі пазней інстытут пазбаўляецца статусу вышэйшай навучальнай установы і пераўтвараецца ў мастацкі тэхнікум, кіраўніком якога прызначаецца *Міхаіл Керзін*, які прыехаў у Віцебск з Веліжу, са Смаленшчыны.

Пасля разгрому Віцебскага мастацка-практычнага інстытута Іван Гаўрыс выкладае у розных навучальных установах Віцебска. Адначасова ён займаецца мастацкай творчасцю, актыўна ўдзельнічае ў беларускім адраджэнні, імкнецца на этнаграфічнай глебе стварыць сучаснае нацыянальнае мастацтва. Гаўрыс з'яўляўся ўдзельнікам 1-ай (1925) і 2-ой (1927) *Усебеларускіх мастацкіх выстаў*, Усебеларускай выставы карцін, графікі, скульптуры, архітэктуры (1930) у Мінску. Але ў 1937 годзе мастак быў арыштаваны па сфабрыкаванай справе «Польскай арганізацыі вайсковай» і 4 лістапада таго ж года растраляны недалёка ад Віцебску, ва ўрочышчы Хайсы.

Як бачым, лёс апошніх двух кіраўнікоў віцебскай мастацкай вучэбнай установы, у адрозненне ад дастаткова паспяховага лёсу Шагала і Дабужынскага, быў вельмі трагічны. Драматычным быў і лёс самой навучальнай установы, якой яны кіравалі. Як памятаем, яна ў 1923 годзе спыніла сваё існаванне, разам жа са знікненнем Віцебскага мастацка-практычнага інстытута былі знішчаны і першыя парасткі дызайну ў савецкай Беларусі. У чым жа прычыны такога лёсу маладога беларускага дызайну і яго дзнячаў? Прычын таму некалькі. У першую чаргу трэба сказаць, што ўзровень вытворчасці ў савецкай краіне ў 1920-я гг. яшчэ не дазваляў увесці ў прамысловасць метады тэхнічнай эстэтыкі. Не зразумелі левае мастацтва, з якім генетычна былі звязаны першыя нашы дызайнеры, і народныя масы, не будучы падрыхтаваныя для ўспрымання новай эстэтыкі.

Адмоўную ролю адыгрывала і поўнае адвяржэнне левымі мастакамі традыцый у мастацтве, рэалізму, а некаторымі з першых нашых дызайнераў наогул станковай карціны. Гэта адвярнула ад левых мастакоў значную частку інтэлігенцыі, у тым ліку старых рэвалюцыянераў, якія былі выхаваны на мастацтве рэалістаў-перасоўнікаў. Адвергла новыя эстэтычныя тэорыі і высокае партыйнае начальства. Справа ў тым, што першыя савецкія дызайнеры пыталіся ўварвацца ў тую сферу, дзе гегемонам павінна была заставацца толькі сама партыя. Яны лічылі, што дзейнасць мастакоў-вытворчаснікаў, як тады ў савецкай краіне называлі дызайнераў, можа служыць будове новага жыцця, выхаванню чалавека новай фармацыі. Ітак, адзін з вытворчаснікаў заяўляў: «Мастацтва як метад будовы жыцця... – вось лозунг, пад якім ідзе пралетарскае ўяўленне аб навуцы мастацтва» [2, с. 36]. Вось ў гэтым першыя савецкія дызайнеры, па меркаванні тых, хто трымаў уладу, «пераходзілі рамкі». Не, толькі партыя на чале з вялікім Салінным можа кіраваць будовай жыцця, той жа, хто прэтэндуе на падмену яе ў гэтай ролі, можа быць небяспечны. Канечне, маладое мастацтва дызайну не магло быць тады

такім ужо моцным канкурэнтам партыі, але яго прэтэнзія на авалоданне хоць часткай яе ўлады над розумамі людзей была парушэннем існаваўшых тады рамак, выхад за якія пагражаў суровым пакараннем, а носьбіты такой ідэалогіі былі асуджаны на знішчэнне.

Так першыя парасткі дызайну ў савецкай Беларусі былі выкарчаваныя, толькі паспеўшы ўзыйсці. Але гэтыя першыя ўсходы квітнелі не дарма. Ідэі, якія распрацавалі ўновісаўцы, не былі забытыя, іх увабралі наступныя пакаленні дызайнераў, як на Беларусі, так і ў іншых рэспубліках былога Савецкага Саюза. Больш таго, гэтыя ідэі перасеклі межы СССР і зрабіліся здабыткам культуры ўсяго цывілізаванага чалавецтва.

## БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЕ ССЫЛКИ


1. Налівайка, Л. Д. Мастацкае жыццё Беларусі 1920-х гадоў // Зборнік выступленняў на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю віцебскай мастацкай школы. – Віцебск, 1994. – С. 3—10.
2. Чужак, Н. Ф. Под знаком жизнестроения (Опыт осознания искусства дня) / Н. Ф. Чужак. – Леф. Москва : 1923. №1.